Адмова ў форме запрашэньня

Эўрапарлямэнт ухваліў рэзалюцыю па Беларусі

Супраць удзельнікаў акцыі Дня Волі хацелі ўжыць супрацьпяхотны сродак

Дэфіцыт гандлёвага балянсу Беларусі ідзе на рэкорд

Звольненую за аповед пра Дзень Волі выкладчыцу Мар’яну Грузьдзіловіч аднавілі на працы

У Берасьці адкрылася выстава забароненых кніг



photo.bymedia.net

Напярэдадні штучнага сьвята — дня яднаньня народаў Беларусі і Расеі 2 красавіка — Масква і Менск абмяняліся ўколамі. Ананімны прадстаўнік Міністэрства фінансаў Расеі заявіў, што Беларусь не атрымае жаданага для яе крэдыту на 100 мільярдаў расейскіх рублёў. «У пазычальніка ўжо багата забабязаньняў перад Расеяй», — зьедліва зазначыла ўрадавая крыніца.

На думку незалежных назіральнікаў, найболей імаверна, што гэтая адмова зьвязаная з ухілістай пазыцыяй Менску ў прынцыповым для Крамля пытаньні прызнаньня Паўднёвай Асэтыі ды Абхазіі. Яно не было ўлучанае ў парадак дня вясновай сэсіі беларускага парлямэнту.

Аляксандар Лукашэнка ўсяляк марудзіць у гэтым пытаньні насуперак ціску Масквы, якая раз-пораз нагадвае пра хаўрусьніцкі абавязак. Экспэрты прадказваюць, што прызнаньня ня будзе сама мала да 7 траўня, калі мусіць адбыцца ўстаноўчы саміт новай праграмы ЭЗ «Усходняе партнэрства». У яе ўжо афіцыйна ўлучаная Беларусь, а Лукашэнка мае шанец атрымаць запрашэньне на саміт. Прызнаньне незалежнасьці Паўднёвай Асэтыі ды Абхазіі, як не аднойчы заяўлялі эўрапейскія палітыкі, сапсуе пэрспэктывы ўдзелу Беларусі ва «Ўсходнім партнэрстве».

Між тым частка беларускай апазыцыі катэгарычна выступае супраць таго, каб 7 траўня Лукашэнка прыляцеў на гістарычнае мерапрыемства ў Прагу (ці, магчыма, Брусэль). На думку былога палітвязьня Аляксандра Казуліна, такое запрашэньне было б вялікай памылкай Эўропы і знакам

таго, што яна адступаецца ад сваіх маральных каштоўнасьцяў, схіляе галаву перад дыктатурай.

Дыскусія на гэты конт разгарэлася і на нефармальнай сустрэчы міністраў замежных спраў Эўразьвязу 27—28 сакавіка ў Чэхіі. Паводле «Радыё Свабода», дасягнутая неафіцыйная дамоўленасьць даслаць запрашэньне прэзыдэнту Беларусі, але пры гэтым даць яму зразумець, што лепей накіраваць на мерапрыемства нейкага чыноўніка ніжэйшага рангу — напрыклад міністра замежных спраў.

«Ход, безумоўна, спрытны, але ёсьць адна праблема. Беларускі афіцыйны лідэр часта не рэагуе нават на наўпроставыя і жорсткія патрабаваньні, тонкія ж намёкі наагул не ўспрымае. Баюся, што эўрапейскія дыпляматычныя шахматы зь іх складанымі камбінацыямі не дапасуюцца да выпадкаў, калі праціўнік здольны «згуляць» шахматнай дошкай па галаве», — зазначае з гэтай нагоды менскі палітоляг Валер Карбалевіч.

Ён таксама прагназуе, што афіцыйны кіраўнік Беларусі, абраўшы стратэгію балянсаваньня між Масквой ды Эўразьвязам, можа спачатку наведаць інаўгурацыйны саміт «Усходняга партнэрства», а вось пасьля таго як упершыню пацісьне рукі заходнім лідэрам, найхутчэй што зробіць рэвэранс перад Крамлём — прызнае мяцежныя грузінскія правінцыі.

Шэраг беларускіх аналітыкаў лічаць, што нават у такім выпадку Эўразьвяз ня стане выкідаць Беларусь са сваёй новай праграмы, бо інакш яна ў значнай ступені страціць свой сэнс.

«У Брусэлю няма іншага выйсьця, акрамя як праглынуць пігулку. Тым болей што, кладучы руку на сэрца, неба на зямлю не ўпадзе. Пытаньне мае сымбалічную, а не рэальную геапалітычную вагу», — зазначае аналітык Аляксандар Класкоўскі.

На яго думку, палітыкі ЭЗ дарэмна так пэдалююць пытаньне пра імавернае прызнаньне Менскам згаданых каўкаскіх рэспублік, бо тым самым толькі распальваюць «спартовы азарт» Масквы. «Лягчэй было б болей выразна патрабаваць, каб Лукашэнка адкручваў гайкі ўнутры краіны, дзе ён поўны гаспадар і дзе каліва лібэралізацыі не такое ўжо і пагрозьлівае для сыстэмы», — мяркуе Класкоўскі.

Тым часам над краінай згушчаюцца хмары фінансава-эканамічнага крызысу. Днямі Белстат абнародаваў інфармацыю, што за два першыя месяцы сёлета адмоўнае сальда замежнага гандлю таварамі дасягнула 1 мільярда 92,4 мільёна даляраў. Гэты паказчык у два з паловай разы большы, чым за студзень — люты летась.

Працяг гэтага трэнду не пакіне ўраду іншага выйсьця, акрамя як зладзіць новую дэвальвацыю кшталту той, што грымнула 2 студзеня 2009 году, калі падзеньне беларускага рубля ў адносінах да даляру на 20,5% стала шокам для беларусаў. Зараз ідуць два паралельныя працэсы — зьніжэньне заробкаў і рост цэнаў, якія прыкметна падкасілі жыцьцёвы ўзровень бальшыні беларусаў.

Паводле вынікаў абнародаванага днямі нацыянальнага апытаньня, якое зладзіў у сакавіку Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў, студзеньская дэвальвацыя значна адбілася на матэрыяльным становішчы 45,5% рэспандэнтаў, нязначна закранула 35,4%. 42,4% беларусаў пасьля гэтага сталі меней давяраць уладам.

Пры гэтым насельніцтва слаба верыць у тое, што апазыцыя здольная ініцыяваць карэнныя зьмены ў краіне. А электаральны рэйтынг Лукашэнкі, насуперак прагнозам палітычных праціўнікаў, якія разьлічвалі, што дэвальвацыя значна зьменшыць папулярнасьць прэзыдэнта, ад сьнежня да сакавіка зьнізіўся толькі на 1% — ад 40,2% да 39,2%.

Фэномэн адносна высокай падтрымкі Лукашэнкі ў беларускім грамадзтве 44,2% апытаных тлумачаць наступным чынам: «Проста няма нікога іншага, хто быў бы лепшы». Аналітыкі адзначаюць: гэта вынік шматгадовага выпальваньня ўладамі палітычнага поля, выкараненьня любой палітычнай альтэрнатывы. Тым болей актуальныя патрабаваньні, выкладзеныя ў рэзалюцыі Эўрапарляманту ад 2 красавіка: рэформа выбарчага заканадаўства, забесьпячэньне свабоды мэдыяў, сходаў і асацыяцый, спыненьне перасьледу апазыцыі, адмена тых артыкулаў Крымінальнага кодэксу, што даюць падставу для пакараньня з палітычных матываў.

Выкананьне гэтых умоваў, зазначаюць эўрапарлямэнтары, стварыла б магчымасьці для «рэінтэграцыі Беларусі ў эўрапейскую сям'ю дэмакратычных краінаў». Але беларускія экспэрты скептычна ацэньваюць імавернасьць таго, што

Менск здольны на значны прагрэс у галіне дэмакратыі і правоў чалавека цягам наступных дзевяці месяцаў, на якія замарожаныя візавыя санкцыі супраць высокіх беларускіх чыноўнікаў.

ПАЛІТЫКА

## Адмова ў форме запрашэньня

***На нефармальнай сустрэчы міністраў замежных спраў Эўразьвязу было папярэдне вырашана даслаць у Менск запрашэньне на саміт Эўрапейскага партнэрства, які адбудзецца ў Празе 7 траўня, даючы адначасова зразумець Аляксандру Лукашэнку, што ў Празе чакаюць не яго, а нейкага іншага прадстаўніка Беларусі. Аднак афіцыйнае рашэньне па гэтым пытаньні так і не было агучана.***

Галоўным апанэнтам запрашэньня беларускага прэзыдэнта выступіў міністар замежных справаў Нідэрляндаў Максім Фэрхаген. Ён запатрабаваў гарантыяў ад кіраўніка Эўракамісіі, што, нягледзячы на запрашэньне, накіраванае Лукашэнку, Беларусь будзе прадстаўляць на саміце міністар замежных справаў Сяргей Мартынаў. У адваротным выпадку галяндзкі дыплямат прыгразіў публічным выкрываньнем беларускага лідэра на саміце.

*«Радыё Свабода»*

АФІЦЫЙНА

## Эўрапарлямэнт ухваліў рэзалюцыю па Беларусі




***На сэсіі Эўрапарлямэнту ў Брусэлі ўхваленая рэзалюцыя наконт разьвіцьця дыялёгу Эўразьвязу і Беларусі.***

«За» прагаласавалі 594 дэпутаты, «супраць» – 19.

У рэзалюцыі эўрапарлямэнтары выказваюць заклапочанасьць станам з правамі чалавека ў Беларусі і выказваюць спадзеў на істотны прагрэс цягам 9-месячнага падаўжэньня мараторыю на візавыя санкцыі супраць беларускага кіраўніцтва.

Эўрапарлямэнт пералічвае шэраг крокаў, якія чакаюць ад афіцыйнага Менску: рэформа выбарчага заканадаўства, забесьпячэньне свабоды СМІ, сходаў і асацыяцый, спыненьне перасьледу апазыцыі, адмена «палітычных» артыкулаў Крымінальнага кодэксу, увядзеньне мараторыю на сьмяротныя пакараньні, прызнаньне Саюзу палякаў пад кіраўніцтвам Анжалікі Борыс.

Калі афіцыйны Менск выканае пералічаныя рэкамэндацыі, то Эўрапарлямэнт выступіць за поўную адмену візавых санкцый і «паскорыць працэс рэінтэграцыі Беларусі ў эўрапейскую сям'ю дэмакратычных краінаў».

*«Радыё Свабода»*

АПАЗЫЦЫЯ

## Супраць удзельнікаў акцыі Дня Волі хацелі ўжыць супрацьпяхотны сродак




***Паводле словаў удзельнікаў дэманстрацыі, на Дзень Волі былі заўважаныя сьпіралі Бруно. У Беларусі на акцыях пратэсту іх маглі ўжыць упершыню.***

Нагадаем, што падчас акцыі 25 сакавіка каля Акадэміі навук маладыя актывісты пайшлі ў бок Кастрычніцкай плошчы, але дарогу ім заступілі супрацоўнікі міліцыі. Удзельнікі акцыі ў гэты момант загаварылі пра магчымае ўжываньне сьпіралі Бруно.

Сьпіраль Бруно — рэч чыста вайсковая. Драцяная супрацьпяхотная перанасная перашкода ўяўляе зь сябе драцяны цыліндар дыямэтрам 0,7–0,9 м і даўжынёй у нармальным стане 10–30 м, сплецены са сьпіраляў калючага дроту. Звычайна такая сьпіраль ставіцца ў некалькі шэрагаў па гарызанталі (мінімум у 2 шэрагі), для павелічэньня жа вышыні зьверху ставіцца яшчэ адна.




«Сьпіралі Бруно, як усе віды драцяных загародаў, выкарыстоўваюцца для таго, каб затрымаць на некаторы час рух суперніка, — растлумачыў гісторык Анатоль Тарас. — Гэтая перашкода, вынайдзеная французам Бруно, упершыню была ўжытая на франтах Першай усясьветнай вайны ў 1914–18 гг. Галоўная каштоўнасьць сьпіралі Бруно – загароду можна хутка разаслаць і хутка прыбраць. Сёньня ў Беларусі сьпіраль Бруно, наколькі мне вядома, нідзе не выкарыстоўваецца. Але, мабыць, кіраўніцтва праваахоўных органаў вырашыла паэкспэрымэнтаваць».

***www.gazetaby.com***

ЭКАНОМІКА

## Дэфіцыт гандлёвага балянсу Беларусі ідзе на рэкорд




***Беларусь ідзе на рэкорд па паказальніку дэфіцыту гандлёвага балянсу за ўсю гісторыю сувэрэнітэту. Паводле дадзеных Белстату, у студзені-лютым 2009 году сальда замежнага гандлю таварамі склалася адмоўным у памеры 1 млрд. 92,4 млн. даляраў, павялічыўшыся ў 2,5 раза ў параўнаньні з аналягічным пэрыядам 2008 году. Прычым у лютым у параўнаньні са студзенем гэтага году адмоўнае сальда павялічылася больш чым на 200 млн. даляраў.***

Калі такая дынаміка падзеньня аб’ёмаў замежнага гандлю захаваецца, то ў канцы году Беларусь проста паб’е рэкорд мінулага году (мінус 6,581 млрд. даляраў) і паставіць новы.

«Да гэтага мы і рухаемся, — лічыць эканаміст дасьледчага цэнтру Інстытуту прадпрымальніцтва і мэнэджмэнту Аляксандар Чубрык, тлумачачы павелічэньне дэфіцыту гандлёвага балянсу нарастаючым крызысам і рэзкім падзеньнем попыту на нашу прадукцыю. — Прычым я бы зьвярнуў увагу вось на што. У студзені-лютым Беларусь скараціла экспарт на 47,8%, а імпарт на 32,1%. То бок імпарт скараціўся нашмат менш. Гэта гаворыць пра тое, што мы працягваем працаваць на склад і вырабляць прадукцыю, якую ніхто не набывае».

***Naviny.by***

ГРАМАДЗТВА

## Звольненую за аповед пра Дзень Волі выкладчыцу Мар’яну Грузьдзіловіч аднавілі на працы

***Увечары 31 сакавіка выкладчыцу адукацыйнага цэнтру «SOL Minsk» Мар’яну Грузьдзіловіч азнаёмілі з загадам, паводле якога адменены папярэдні загад пра яе звальненьне.***

Нагадаем, што выкладчыцу ангельскай мовы звольнілі 25 сакавіка пасьля таго, як яна адрэагавала на зьняважлівую рэпліку адносна тых, хто сьвяткуе Дзень Волі.

***«Радыё Свобода»***

КУЛЬТУРА

# У Берасьці адкрылася выстава забароненых кніг

***У Берасьцейскай абласной бібліятэцы 31 сакавіка адкрылася выстава «100 забароненых кніг», паведамляе БелаПАН.***

«Такая выстава праводзіцца ў бібліятэцы ўпершыню, гэта свайго роду гісторыя савецкай і замежнай цэнзуры, пачынаючы з 1917 году па 2000-ы», — зазначыла намесьнік дырэктара па навуцы бібліятэкі Ала Мясьнянкіна. Яна нагадала, што забароны ўводзіліся альбо на ўсе творы пісьменьніка, які прызнаваўся «ворагам народу», альбо на канкрэтную кнігу, калі ў ёй узгадваліся «ворагі народу», а таксама ўтрымліваліся спасылкі на іх выступы. Былі таксама іншыя прычыны, паводле якіх кнігі станавіліся недасяжнымі для шырокага чытача.

Цяперашняя экспазыцыя складаецца са 100 кніг рускіх, савецкіх і замежных аўтараў, чые творы былі забароненыя і канфіскоўваліся з фондаў бібліятэк. У іх ліку «Д'яблы» Фёдара Дастаеўскага, «Чапаеў» Дзьмітрыя Фурманава, «Залатая ліпа» Ільлі Дубінскага, «У запас» Андрэя Платонава, «Лаліта» Ўладзімера Набокава, «Зьнесеныя ветрам» Маргарэт Мітчал, «Па кім звоніць звон» Эрнэста Хемінгуэя, «Дзесяць дзён, якія ўзрушылі сьвет» Джона Рыда.

Удзельнікі прэзэнтацыі маглі даведацца пра прычыны і тэрміны забароны на кожную з прадстаўленых кніг.

***www.naviny.by***

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

Polish aid

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.